**УДК 947.6 + 323.15 (476)**

# ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ І ФАРМІРАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ (1991 – 2005 гг.)

***канд. гіст. навук, дац. І.А. ПУШКІН***
***(Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання)***

*Разглядаюцца мэты і праграмныя накірункі развіцця грамадскіх арганізацый нацыянальных меншасцей Беларусі. На падставе аналізу статутаў і дзейнасці вызначаны агульныя тэндэнцыі і роля нацыянальных меншасцей ў беларускім грамадстве на працягу 1991 – 2005 гадоў. Пераважная большасць грамадскіх арганізацый займалася захаваннем нацыянальных традыцый і прапагандай сваёй культуры. Больш за палову праводзілі працу па захаванню і прапагандзе помнікаў гісторыі і культуры свайго народа; ставілі перад сабою мэту нацыянальнага адраджэння і развіцця культуры, каб захаваць саматоеснасць і пазбегнуць асіміляцыі. Некаторыя абаранялі нацыянальныя і грамадзянскія правы, годнасць, аказвалі дабрачынную дапамогу; праводзілі асветную дзейнасць.*

*Нацыянальныя меншасці адыгрывалі даволі значную ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі. Дзейнасць іх грамадскіх арганізацый садзейнічала працэсу фарміравання грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь*

**Уводзіны.** За гады савецкай улады ў Рэспубліцы Беларусь склаўся этатычны тып дзяржавы з падагуленай свядомасцю і неабходна мяняць яго на актывісцкі з мэтай пераўтварэнняў у грамадска-палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферы.

Грамадзянская супольнасць – сістэма самастойных і незалежных ад дзяржавы грамадскіх інстытутаў і адносін, якія прызваны забяспечыць умовы для самарэалізацыі асоб і калектываў, рэалізацыі прыватных інтарэсаў і запатрабаванняў. Фарміраванне грамадзянскай супольнасці адбываецца ў першую чаргу па ініцыятыве і дзякуючы актыўнасці насельніцтва («знізу»).

**Прадметам дадзенага даследавання** з'яўлялася дзейнасць грамадскіх арганізацый нацыянальных меншасцей Беларусі (у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаваны тэрмін – нацыянальныя супольнасці) і якім чынам яны спрычыняюцца да фарміравання грамадзянскай супольнасці.

Іншаэтнічныя групы складаюць значную частку насельніцтва Рэспублікі Беларусь – 19,8 % (перапіс 1999 года).

Найбольш выразнымі і актыўнымі формамі ўдзелу прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей у грамадска-палітычным жыцці з'яўляецца іх дзейнасць у грамадскіх арганізацыях (ГА).

Першыя грамадскія аб'яднанні нацыянальных меншасцей узніклі ў 1989 годзе. У 2004 годзе ў Беларусі дзейнічалі 122 грамадскія арганізацыі і іх саюзы, якія прадстаўлялі 24 нацыянальныя меншасці (у нашай дзяржаве стала жывуць 107,8 тыс. грамадзян іншых краін). Сярод арганізацый – 47 яўрэйскіх, 12 польскіх, 9 нямецкіх, па 8 рускіх і літоўскіх, па 5 азербайджанскіх, украінскіх і татарскіх, 3 армянскіх, 4 цыганскіх, па 2 грэчаскіх і грузінскіх. У Беларусі таксама былі і ёсць нацыянальныя арганізацыі арабаў, афганцаў, башкір, дагестанцаў, казахаў, карэйцаў, латышоў, малдаван, сірыйцаў, туркаў, чувашоў, эстонцаў [1, с. 235 – 245]. У цяперашні час у Беларусі дзейнічаюць каля 250 нацыянальных грамадскіх арганізацый.

Аналіз статутаў і працы грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных меншасцей Беларусі дазваляе вызначыць накірункі іх дзейнасці і ролю ў жыцці беларускага грамадства пры фарміраванні грамадзянскай супольнасці: 89,2 % ад агульнай колькасці прааналізаваных, займаліся захаваннем нацыянальных традыцый і прапагандай сваёй культуры шляхам стварэння калектываў мастацкай самадзейнасці, правядзення канцэртаў, конкурсаў, фестываляў, выстаў і г.д.; 78,4 % – прадстаўлялі розныя інтарэсы сваіх сяброў (членаў) у дзяржаўных і іншых установах; 54,1 % праводзілі працу (ці планавалі) па захаванню і прапагандзе помнікаў гісторыі і культуры свайго народа; 45,9 % – ставілі перад сабою мэту нацыянальнага адраджэння і развіцця культуры, каб захаваць саматоеснасць і пазбегнуць асіміляцыі; 40,5 % – збіраліся і адстойвалі сацыяльныя і эканамічныя правы, дапамагалі суайчыннікам; 37,8 % – садзейнічалі фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці; 32,4 % абаранялі нацыянальныя і грамадзянскія правы, годнасць; 29,7 % займаліся праблемай адраджэння і развіцця роднай мовы; 21,6 % – дабрачыннай дапамогай і ўшанаваннем памяці славутых асоб сваёй нацыянальнасці, ахвяр Халакосту і г.д.; 18,9 % – спрыялі грамадскай актыўнасці асобам сваёй нацыянальнасці, давалі магчымасць для самарэалізацыі, раскрыцця свайго творчага патэнцыялу; такі ж працэнт грамадскіх аб'яднанняў праводзіў асветную дзейнасць (стваралі нацыянальныя школы, класы па вывучэнню роднай мовы і г.д.); 16,2 % імкнуліся да стварэння сваіх нацыянальных цэнтраў, каардынацыі намаганняў у справе захавання нацыянальнай саматоеснасці; 16,2 % прадугледжвалі спрыянне вывучэнню ўласнай гісторыі, займаліся навуковай і даслед-

чыцкай дзейнасцю; 13,5 % – выдавецкай (газеты «Истоки», «Głos znad Niemna», часопіс «Мишпоха» і інш.); 5,4 % садзейнічалі грамадзянскай самасвядомасці; 5,4 % выступалі за інтэграцыю з іншымі краінамі; 5,4 % планавалі выхоўваць пачуццё сваёй уласнай нацыянальнай выключнасці; 2,7 % імкнуліся змагацца з шавінізмам і нацыяналізмам і столькі ж збіраліся для выканання статутных мэтаў і задач, выкарыстоўваць актыўныя метады грамадскіх дзеянняў: мітынгі, маніфестацыі, масавыя акцыі*.

Адным з першых у Беларусі было зарэгістравана аддзелам культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ў лютым 1990 года таварыства «Палонія». У тым жа годзе быў утвораны Саюз палякаў Беларусі (СПБ). Гэта самае масавае нацыянальнае грамадскае аб’яднанне, якое ставіць перад сабою мэты нацыянальнага адраджэння, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, грамадскай актыўнасці палякаў Беларусі, абароны іх нацыянальных і грамадзянскіх правоў, выяўлення патрэб і праблем, абуджэння грамадзянскай самасвядомасці польскага насельніцтва Беларусі ў грамадскім жыцці, супрацьдзеяння шавінізму і нацыяналізму, развіццю патрыятызму і інш. З самага пачатку члены Саюза паводзілі сябе вельмі актыўна. Яны пісалі петыцыі, выстаўлялі пікеты каля абл- і райвыканкамаў, настойвалі на сваіх патрабаваннях. Іх намаганнямі ў Лідзе быў пастаўлены помнік А. Міцкевічу, у Вілейцы – памятнік легіянерам Ю. Пілсудскага. Прыкладаліся намаганні аб’яднаць дэпутатаў-палякаў у Вярхоўным Савеце 12 склікання (іх было каля 30), але з гэтага нічога не атрымалася [2, с. 241 – 242].

У студзені 1998 года на тэрыторыі Беларусі меліся 10 Дамоў палякаў (у якасці матэрыяльнай базы СПБ) і 14 польскіх бібліятэк [3, л. 54]. У тым жа годзе грамадскае аб’яднанне мела структуры ў 6 абласцях, 51 раёне, 150 вясковых мясцовасцях, налічвала каля 30 тысяч членаў. Саюз палякаў Беларусі аб’ядноўваў 65 польскіх самадзейных калектываў (з іх 40 у Гродзенскай вобласці): хары, вакальныя групы, ансамблі спеваў і танцаў, танцавальныя калектывы, вакальна-інструментальныя ансамблі, фальклорныя групы. У 1997 годзе быў заснаваны ў Гродна польскі тэатр (кіраўнік В. Сілкін). У 1997 – 1998 гадах СПБ ініцыіраваў справу аб прызнанні ветэранамі вайны грамадзян Беларусі, якія служылі ў фарміраваннях Арміі Краёвай [3, л. 72]. Саюз палякаў неаднаразова звяртаўся ў Навагрудскі райвыканкам з прапановамі дапамогі ўладам у справе фінансавання пабудовы польскай школы ў Навагрудку [3, л. 99 – 100].

Пад эгідай ГА «СПБ» дзейнічалі больш дзесяці структур, у тым ліку: маладзёжныя, студэнцкія, Польскае навуковае таварыства, Таварыства польскіх гісторыкаў, Таварыства медыцынскіх сясцёр і акушэраў, Таварыства народных майстроў, Таварыства польскіх мастакоў, Польскае таварыства ўрачоў на Гродзеншчыне, Таварыства жаўнераў Арміі Краёвай, Таварыства польскіх ветэранаў, Таварыства палякаў – ахвяр палітычных рэпрэсій, Спартыўны клуб «Баторы», Гандлёва-прамысловая палата, камітэты памяці А. Міцкевіча і Э. Ажэшка і інш. «Саюз польскага харцарства на Беларусі», які дзейнічае пры СПБ, ставіць сваёй асноўнай задачай – выхаванне грамадзянскай пазіцыі ў маладога пакалення, пачуцця кло-пату і адказнасці за лёс сваёй дзяржавы – Беларусі [4, 5]. Грамадская арганізацыя «СПБ» мае ўласны друкаваны орган – штотыднёвую газету «Głos znad Niemna».

23 чэрвеня 1991 года на свяце Курбан-Байрам у Іуі, дзе прысутнічалі шматлікія пасланцы з усёй Беларусі, было створана рэспубліканскае згуртаванне татар-мусульман на Беларусі «Аль-Кітаб» [6, с. 201].

27 кастрычніка 1997 года ў Беларусі быў зарэгістраваны статут Кангрэса палякаў. Грамадская арганізацыя ставіла перад сабой задачы: «абуджэння грамадзянскай самасвядомасці польскага насельніцтва Рэспублікі Беларусь у грамадска-палітычным і эканамічным жыцці; выхавання патрыятызму і павагі да гісторыі і г.д.» [3, л. 48 – 49]. Такім чынам, можна адзначыць, што гэтае аб’яднанне ставіла перад сабою мэты актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці нашай дзяржавы. На 01.01.2004 г. Кангрэс палякаў не значыўся ў спісе афіцыйна зарэгістраваных аб’яднанняў нацыянальных меншасцей Беларусі [7, с. 235 – 245].

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на пачатак 2005 года органамі юстыцыі былі зарэгістраваны 8 грамадскіх аб’яднанняў, створаных польскай грамадскасцю Беларусі. У рэспубліцы на польскай мове выдаюцца 4 газеты і 2 часопіса, вядзецца выкладанне ў школах і спецыялізаваных класах.

За абарону грамадзянскіх правоў выступалі грамадскія аб’яднанні немцаў «Айнтрахт» (г. Ліда), грэкаў «Пелапанэс», азербайджанцаў «Хазар», грузінаў «Іберыя», цыган (г. Ашмяны).

Грамадская арганізацыя «Беларуская цыганская дыяспара» ставіла перад сабою мэты – дамагацца кампенсацыі ахвярам Халакоста, забеспячэнне сацыяльнага статуса і працаўладкавання ромскага насельніцтва, юрыдычнай абароны цыган і вырашэння праблем крымінальнай сітуацыі ў цыганскім асяродку і інш. У Мінску зарэгістраваны і дзейнічаюць 1 міжнароднае і 2 рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднання цыган, у г.п. Ашмяны – раённае. Згодна інфармацыі ГА «Беларуская цыганская дыяспара» тры прадстаўнікі цыганскай нацыянальнасці вылучаліся ў Палату прадстаўнікоў і мясцовыя саветы. У снежні 2004 года выйшаў першы нумар інфармацыйнага бюлетэня ГА «Беларуская цыганская дыяспара» пад назвай

* Нацыянальныя меншасці Беларусі: грамадска-палітычная дзейнасць і сацыяльна-прававы статус: справаздача аб НДП (заключ.) / Маг. дзярж. ун-т харчавання; кір. тэмы І.А. Пушкін. – Магілёў, 2005. – 160 с. – № ДР 20041397.

«Романолав» («Цыганскае слова»). У нашай дзяржаве добра вядомы ансамблі цыган (2004 г.): «Джана Рома» з Ашмян, «Тэрнэ Бэрша» з Магілёва, «Гіля Ромэн» з Лельчыц і інш. [8].

Найбуйнейшая этнічная група Беларусі прадстаўлена рускімі. У сацыяльна-палітычным і нацыянальным аспектах рускаму насельніцтву адкрыты шырокія магчымасці і перспектывы для рэалізацыі этнічных і моўна-культурных патрэб. Руская мова з'яўляецца другой дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь. У краіну паступае расійская прэса, выходзяць мясцовыя рускамоўныя выданні, існуюць тэатры, на рускай мове вядуцца праграмы радыё і тэлебачання, ажыццяўляецца навучанне ў школах і вышэйшых навучвльных установах. Зарэгістраваны і дзейнічаюць грамадскія аб'яднанні, якія аб'ядноўваюць асоб рускай нацыянальнасці. Найбуйнейшае – «Рускае таварыства», якое ставіць мэтай захаванне і прапаганду рускай культуры.

За інтэграцыю з Расіяй і выхаванне ўласнай нацыянальнай выключнасці выступаюць праславянскія і некаторыя рускія яб'яднанні як афіцыйна зарэгістраваныя, так і не прайшоўшыя рэгістрацыю. Так, у статуце ГА «Паслы славянства» былі зафіксаваны наступныя задачы: інтэграцыя з Расіяй; распаўсюджванне праўдзівай інфармацыі аб славянскай культуры; падтрымка дзеячаў культуры, якія падвергліся нападу за абарону нацыянальнай рускай культуры і г.д. [5]. Падобныя мэты і задачы ў Віцебскага ГА «Руская абшчына». Апошняе на свае сродкі выдае газету «Истоки» [9, с. 8].

У 1990-х гадах на тэрыторыі Брэсцкай вобласці існавалі ўкраінскае грамадскае аб'яднанне «Прасвіта Берасцейшчыны» імя Т. Шаўчэнкі і Украінскае грамадска-культурнае аб'яднанне Брэсцкай вобласці. Іх дзейнасць побач са станоўчай насіла і экстрэмісцкі характар. Так, кіраўнікі аб'яднанняў на старонках газет «Берасцейскі край» і «Голас Берасцейшчыны» неаднаразова бяздоказна абвінавачвалі Рэспубліку Беларусь у прымусовай асіміляцыі і дыскрымінацыі ўкраінцаў, тым самым ствараючы падставы для ўзнікнення міжнацыянальнай напружанасці. Спецыялісты Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь адзначалі, што з боку гэтых украінскіх аб'яднанняў гучалі зняважлівыя выказванні наконт тытульнага этнасу-беларусаў, іх мовы, заклікі да перагляду дзяржаўных межаў [3, л. 15 – 19]. У спісе грамадскіх арганізацый прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Рэспублікі Беларусь на 01.01.2004 г. ГА «Прасвіта» Берасцейшчыны» імя Т. Шаўчэнкі і Украінскае грамадска-культурнае аб'яднанне Брэсцкай вобласці як афіцыйна зарэгістраваныя не значацца.

З 1995 года бярэ пачатак дзейнасць ГА «Цэнтр украінскай культуры «Січ» у г. Мінску. Аб'яднанне было ўтворана з мэтай – садзейнічаць захаванню і развіццю ўкраінскай культуры, самаідэнтыфікацыі ўкраінскага этнаса ў Беларусі, фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, гістарычнай памяці, стварэнню ўмоў для нацыянальна-культурнага развіцця.

Пры цэнтры «Січ» дзейнічае хор украінскай песні «Крыніца», да 2002 года існаваў дзіцячы танцавальны ансамбль, да 2001 года функцыяніравалі школа выхаднога дня і «Клуб сяброў Украіны». Грамадская арганізацыя «Цэнтр украінскай культуры «Січ» правёў у 1999, 2002 гадах V і VI рэспубліканскія фестывалі мастацтваў украінцаў Беларусі.

У 1996 годзе быў утвораны ў горадзе Брэсце Украінскі навукова-педагагічны саюз Беларусі «Берагіня». Мэта аб'яднання – яднанне педагагічных, навуковых і культурных дзеячоў Беларусі ў справе развіцця сістэмы ўкраінскай адукацыі, вывучэння ўкраінскай мовы, культуры. Пры аб'яднанні дзейнічаюць: Украінскі студэнцкі эксперыментальны тэатр «Арт – Майдан», турыстычны клуб «Энергія». Да найбольш значных мерапрыемстваў «Берагіні» за 1999 – 2004 гады варта аднесці: штогадовыя Шаўчэнкаўскія чытанні; арганізацыя і правядзенне штогадовых турыстычных вандровак (Карпаты, Крым); штогадовыя тэатральныя вечары; падрыхтоўка і выданне вучэбных дапаможнікаў.

У рэспубліцы дзейнічае аб'яднанне беларускіх літоўцаў. Асноўнымі мэтамі таварыства з'яўляюцца пашырэнне сувязей паміж народамі Беларусі і Літвы, захаванне гістарычнай памяці, культуры, нацыянальнай самасвядомасці, мовы і звычаяў сярод літоўскага насельніцтва Рэспублікі Беларусь. У вёсцы Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці вялося будаўніцтва Літоўскага нацыянальнага культурнага цэнтра на сродкі Літвы. Заказчык будаўніцтва – Рэспубліканская ГА «Беларуская абшчына літоўцаў». У 1996 годзе было завершана будаўніцтва школы, 7 дамоў для настаўнікаў; у 1997 – пабудаваны інтэрнат на 70 месцаў, сталоўка, дзіцячы сад; 1998 – кацельная, зроблена ацяпленне. У 2000 годзе было завершана будаўніцтва дома культуры [10].

У красавіку 1991 года з мэтай адраджэння яўрэяў Рэспублікі Беларусь як нацыянальнай, так і культурнай супольнасці, іх кансалідацыі было створана Беларускае аб'яднанне яўрэйскіх арганізацый і абшчын (БАЯАА). У аб'яднанне увайшло звыш 135 арганізацый і суполак з 16 гарадоў краіны. За час свайго існавання аб'яднаннем адкрыты 14 нядзельных школ па вывучэнню мовы і культуры яўрэйскага народа, дзве агульнаадукацыйныя школы (у Мінску і Магілёве). Намаганнямі таварыства выдаецца 4 яўрэйскія газеты і спецыяльная газета для моладзі. Адкрыты яўрэйскі народны універсітэт. У Мінску і Магілёве працуюць дзіцячыя садкі.

У Беларусі працуюць яўрэйскія дабрачынныя цэнтры «Хэсэд-Рахамім» (Мінск), «Хэсэд-Раха» (Віцебск), «Хэсэд-Бація» (Гомель), «Хэсэд-Барух «(Магілеў), а таксама асобныя группы міласэрнасці (Барысаў,

Ліда, Мазыр, Орша, Рэчыца, Брэст і інш.). Першая группа міласэрнасці ў рэспубліцы ўзнікла ў Мінскім гарадскім аб'яднанні яўрэйскай культуры ў 1989 годзе. Актывісты гэтай групы аказывалі дапамогу адзінокім яўрэям і ляжачым інвалідам усіх нацыянальнасцей, якія знаходзіліся ў Доме інвалідаў (Дражня). З дапамогай Джойнта на аснове гэтай группы ў 1991 годзе была спачатку створана дабрачынная арганізацыя «Рахамім», затым пераўтвораная ў лютым 1995 года ў цэнтр «Хэсэд-Рахамім». Асноўная праца цэнтра рабілася добраахвотнікамі (валанцёрамі). Сярод накірункаў дзейнасці – пракат медыцынскага абсталявання, дапамога адзінокім у быту, прыбіранне кватэр, дагляд за хворымі, абеды на даму, дробны рамонт, размеркаванне лекаў, праца клубаў і гурткоў па інтарэсах, вывучэнне традыцый, правядзенне святаў і інш. [11, с. 69].

Неабходна ведаць, што грамадскія аб'яднанні нацыянальных меншасцей Беларусі не толькі спажыўцы з «кішэні» падаткаплацельшчыкаў альбо краін сваёй этнічнай радзімы. Яўрэйскія, польскія, нямецкія і іншыя аб'яднанні аказвалі неаднаразова гуманітарную дапамогу дзяржаўным установам, інтэрнатам Беларусі. Напрыклад, пасля правядзення фестывалю «Усходні слодыч» значныя сродкі былі пералічаны інтэрнатам Мінска, на пабудову Нацыянальнай бібліятэкі; грамадскае аб'яднанне немцаў з Бабруйска падаравала аргтэхніку савету па справах рэлігій і нацыянальнасцей Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта і інш. [8].

Аналіз рэалізацыі правоў нацыянальных меншасцей на стварэнне грамадскіх аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь і вывучэнне практычнай дзейнасці нацыянальных ГА дазваляе зрабіць некаторыя высновы.

Сваё жаданне і памкненні да творчай самарэалізацыі, задавальненне нацыянальных запатрабаванняў прадстаўнікі нацменшасцей імкнуцца рэалізаваць, выкарыстоўваючы ў поўным аб'ёме магчымасці, якія ёсць у культурна-асветнай сферы. Аб гэтым сведчыць вялікая колькасць творчых і мастацкіх самадзейных калектываў, якія створаны і ствараюцца пры нацыянальных аб'яднаннях і дзяржаўных установах культуры. Амаль усе мерапрыемствы, якія праводзіліся і праводзяцца нацыянальнымі ГА з дазволу ўладаў Беларусі, у асноўным культурна-асветніцкага накірунку.

З 1999 года назіраецца пэўнае памяншэнне актыўнасці з боку як асобных прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей, так і нацыянальных грамадскіх арганізацый. Гэта выклікана некаторымі абмежаваннямі з боку ўладаў у сферы стварэння і дзейнасці палітычных партый і грамадскіх арганізацый (асабліва ў грамадска-палітычным жыцці), а таксама агульным становішчам, калі былі абмежаваны магчымасці рэальных змен шляхам грамадзянскіх ініцыятыў. Запанавалі апатыя і песімізм у грамадска-палітычным накірунку дзейнасці ГА нацыянальных меншасцей.

Можна сцвярджаць, што сярод нацыянальных меншасцей найлепш арганізаваным з'яўляецца польскае, яўрэйскае, украінскае насельніцтва. Яно больш актыўна ўключаецца ў новыя грамадска-палітычныя працэсы. Латышскае, літоўскае, нямецкае, рускае, цыганскае насельніцтва больш пасіўнае, часцяком актывізуе працу пры ўмовах фінансавання з боку.

Нацыянальныя меншасці ў перыяд 1991 – 2005 гадоў адыгрывалі даволі значную ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі, дзейнасць іх грамадскіх арганізацый садзейнічала працэсу фарміравання грамадзянскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

ЛІТАРАТУРА


1. Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік / склад. Н.В. Ходар. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2004. – 272 с.
2. Национально-государственные интересы Республики Беларусь / под ред. Л.Ф. Заико. – Минск: Изд. В.М. Скакун, 1999. – 268 с.
3. Бягучы архіў Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (АКСРН). – Фонд «Перапіска аддзела нацыянальнасцей». – Спр. 03 – 04, 1998. – Т. 1.
4. АКСРН. – Фонд «Перапіска аддзела нацыянальнасцей». – Спр. 03 – 04, 1999. – Т. 3.
5. АКСРН. – Фонд «Перапіска аддзела нацыянальнасцей». – Спр. 03 – 04, 2000. – Т. 1.
6. Думін, С.У. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць / С.У. Думін, І.Б. Канапацкі. – Мінск: Полымя, 1993. – 202 с.
7. Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь. Даведнік / склад. Н.В. Ходар. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2004. – 272 с.
8. АКСРН. – Фонд «Перапіска аддзела нацыянальнасцей». – Спр. 03 – 04, 2004. – Т. 2.
9. Кравцов, А. Мы ставим цель / А. Кравцов // Истоки. – 2004. – февр. – С. 8.
10. АКСРН. – Фонд «Перапіска аддзела нацыянальнасцей». – Спр. 03-04, 2000. – Т. 2.
11. Иоффе, Э. Джойнт в Беларуси / Э. Иоффе, Б. Мельцер. – Минск: ООО «Мэджик Бук», 1999. – 94 с.


*Паступіў 03.11.2006*